**Інструкцыя для трансферных і транзітных пасажыраў**

Грамадзяне краін, для якіх не патрабуецца транзітная віза Рэспублікі Беларусь і якія маюць пасадачны талон на наступны рэйс (багаж аформлены да канцавога пункта пасадкі), пасля праходжання ўсіх відаў кантролю могуць пакінуць зону прылёту. Пасля аб’яўлення пасадкі на рэйс гэтыя пасажыры накіроўваюцца ў пункт перадпалётнага надгляду, праходзяць мытны і пашпартны кантроль і далей накіроўваюцца ў сектар вылету, указаны ў пасадачным талоне.

Гамадзяне краін, якім патрэбна транзітная віза Рэспублікі Беларусь, з зоны прылёту па лесвічным пралёце або выкарыстоўваючы ліфт, падымаюцца на ўзровень 2-га паверха, дзе ў зоне абслугоўвання трансферных пасажыраў праходзяць: кантроль праязных дакументаў, перадпалётны надгляд, мытны кантроль і далей ідуць у залу вылету міжнародных рэйсаў на 3-і паверх у сектар вылету, указаны ў пасадачным талоне.

Надгляд багажу трансферных пасажыраў, аформлены да канцавога пункта палёту, ажыццяўляецца ў зоне апрацоўкі багажу без прысутнасці пасажыра.

Багаж, які аформлены да Мінска, уладальнік багажу павінен асабіста прад’явіць для мытнага надгляду ў зоне прылёту, для чаго неабходна прайсці пашпартны кантроль і далей на стойцы рэгістрацыі (3-і паверх залы вылету) зарэгістраваць багаж да аэрапорта назначэння.